**Заключэнне.** Найбольшая колькасць уласнабеларускіх слоў адносіцца да назваў прадметаў побыту. Асноўная частка лексічных адзінак, што называюць асоб паводле асаблівасцяў характару і паводзін, маюць адмоўную канатацыю Народна-дыялектная мова Віцебшчыны не адлюстроўвае ўласнабеларускай навуковай тэрміналогіі.

Літаратура:
1. Вушацкі словазбор Рыгора Барадуліна / укл. Н. Давыдзенка; прадм. У. Някляева. – Мінск: Кнігазбор, 2013. – 388 с.
2. Касьпяровіч, М. Віцебскі краёвы слоўнік (матар'ялы) / М. Касьпяровіч ; пад рэд. М.Я. Байкова і праф. Б.І. Эпімаха-Шыпілы. – 2-е выд., стэрэат. – Менск : ARCHE, 2011. – 371 с.
3. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / Л.І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2012. – Ч. 1. – 304 с.
4. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / пад рэд. А.С. Дзядовай. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2014. – Ч. 2. – 358 с.
5. Слоўнік Сенненшчыны : у 3 т. Т. 1: А–К / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культ., мовы і літ-ры, філ. "Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы" ; уклад. : Н.М. Бунько [і інш.] ; рэд. В.М. Курцова, Л.П. Кунцэвіч. – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 519 с.

## ТВОРЧАСЦЬ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА Ў БЕЛАРУСКІМ ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВЕ

***Бардзюкова М.В.,***
*магістрант ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
Навуковы кіраўнік – Русілка В.І., канд. філал. навук, дацэнт

Прозвішча Уладзіміра Караткевіча трывала ўвайшло ў гісторыю літаратуры – беларускай, усеславянскай, сусветнай. Караткевіч – паэт жыццёвага шчасця, пераможнай рамантыкі, вольнага, гарманічнага і ўсеабдымнага кахання.

Актуальнасць дадзенай працы заключаецца ў тым, што ўзнікае неабходнасць асэнсаваць і абагульніць вялікую колькасць даследаванняў па творчасці У.Караткевіча.

Мэта даследавання – сістэматызацыя існуючых ў беларускім літаратуразнаўстве літаратурна-крытычных даследаванняў па творчасці У.Караткевіча.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з'яўляюцца літаратурна-крытычныя даследаванні па творчасці Уладзіміра Караткевіча. Метады даследавання: дэскрыптыўны, структурна-аналітычны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Уладзімір Караткевіч прыйшоў у літаратуру ў сярэдзіне XX стагоддзя і зведаў на ўласным лёсе ўсе асаблівасці той гістарычнай эпохі. На пачатку XXI яго заслужана называюць знакавым беларускім мастаком, "улюбёным" пісьменнікам шматлікіх чытачоў зямлі, якая мроілася яму "пад белымі крыламі". Уладзімір Караткевіч арганічна засвоіў вопыт беларускай і сусветнай культур і змог сказаць сваё, адметнае слова, істотна ўзбагаціў беларускую літаратуру ў ідэйна-тэматычных і жанрава-стылёвых адносінах, напоўніў яе інтэлектуальным і філасофскім зместам. Караткевіч меў энцыклапедычныя веды, быў таленавітым мастаком, цудоўным спеваком, выдатным апавядальнікам, здольным артыстам, нястомным вандраўніком і моцна любіў Беларусь [1, с. 32].

Калі звярнуцца да пытання распрацаванасці творчасці Уладзіміра Караткевіча ў крытычнай і метадалагічнай літаратуры, то варта назваць некаторых аўтараў. Так, творчасць У.Караткевіча наогул разглядалі наступныя літаратуразнаўцы: А. Мальдзіс, В. Шынкарэнка, А. Русецкі, А. Сабалеўскі, А. Верабей, М. Жабінская і многія іншыя. Уладзімір Караткевіч шмат зрабіў для развіцця адраджэнскіх ідэй, для абуджэння нацыянальнай свядомасці беларусаў.

На маю думку, найбольш удала і лаканічна творчасць Караткевіча прадстаўлена ў працах А. Вераб'я і А. Русецкага. Тут, асаблівая ўвага нададзена вывучэнню паэзіі. Так, напрыклад, у кнізе Анатоля Вераб'я "Абуджаная памяць: нарыс жыцця і творчасці Уладзіміра Караткевіча" (1977), ёсць раздзел пад назвай "Пад ветразем паэзіі". Тут прадстаўлены першыя паэтычныя зборнікі паэта "Матчына душа" (1958), "Вячэрнія ветразі" (1960), "Мая Іліяда" (1969), "Быў. Ёсць. Буду" (1986) і іх тэматычная разнастайнасць. Аркадзь Русецкі ў сваёй кнізе "Уладзімір Караткевіч: "Праз гісторыю ў сучаснасць" прадстаўляе некалькі раздзелаў, якія прысвечаны паэзіі творца. Першы – "Сацыяльна-філасофская накіраванасць паэзіі У. Караткевіча". Тут аўтар спрабуе вызначыць стрыжнявую аснову паэзіі. Выяўляе філасофскую канцэпцыю балад, паэм і вершаў Караткевіча. Другі – "Маральна-эстэтычная скіраванасць паэзіі У. Караткевіча". У гэтым раздзеле Аркадзь Русецкі спрабуе выдзеліць некаторыя галоўныя кірункі мастацкага аналізу праблем маралі і эстэтыкі, характэрныя для паэзіі. Трэці – "Паэзія У.Караткевіча і вусная народная творчасць". На думку А.Русецкага, моцны фальклорны струмень, да якога беспамылкова прыпаў У. Караткевіч, пранізвае ўсю яго паэтычную творчасць, напаўняе яе народным пачаткам, сінкрэтычнасцю, традыцыйнай паэтыкай. Бадай што няма ніводнага фальклорнага жанру, які не знайшоў бы свайго выкарыстання ў Караткевічавых творах [2, с. 134]. У чацвёртым раздзеле размова ідзе пра любоўную лірыку Караткевіча. Паэзіі Караткевіча ўласціва яркая вобразнасць, глыбіня філасофскага роздуму, асацыятыўнасць мыслення.

Шырокае прызнанне ў Беларусі і далёка за яе межамі прынесла У. Караткевічу яго проза. Анатоль Верабей пісаў: "Для пісьменніка важна было паказаць той час, пра які ён пісаў, раскрыць адносіны паміж



Рэпазіторый ВДУ

людзьмі, перадаць іх псіхалогію, іх жыццё. Характэрная адзнака творчай манеры аўтара пры ўзнаўленні падзей далёкай мінуўшчыны – фальклорна-рамантычны падыход да гістарычных падзей, увага да гістарычнай легенды” [1, с. 56]. Для прозы Караткевіча характэрны вострая фабула, яркія характары, пастаноўка сацыяльна значных праблем. У сваёй манаграфіі, Анатоль Верабей сярод іншых твораў аналізуе апавяданне “Рабіна”, падкрэсліваючы той факт, што пісьменнік добра перадаў нюансы душэўных перажыванняў падлетка, яго глыбокае, да самазабыцця, пачуццё і адначасова крыўду і боль ад нераздзеленага кахання. Дасканала аўтар разгледзеў апавяданне “Багун-трава”, у якім галоўная гераіня – гэта пажылая жанчына Каваліха. Пісьменнік знайшоў цікавыя дэталі для абмалёўкі душэўнага стану сваёй гераіні. Значнае месца адводзіцца і раману “Каласы пад сярпом тваім”. А.Верабей спасылаецца на думку Генадзя Кісялёва пра тое, што пісьменнік дасканала перадаў у рамане усю складанасць сацыяльных і нацыянальных супярэчнасцей адлюстраванай эпохі, выявіў добрае веданне дакументальных і гістарычных матэрыялаў, выкарыстаў мастацкую інтуіцыю. Аўтар манаграфіі падкрэслівае і думкі Адама Мальдзіса, які сцвярджаў, што пісьменнік праўдзіва ўзнавіў у рамане дух таго часу, па-новаму глянуў на ролю шляхты і сялян у будучым паўстанні.

**Заключэнне.** Такім чынам, творчасці Караткевіча прысвечана вялікая колькасць змястоўных тэарэтычных і літаратурна-крытычных артыкулаў. Даследчыкі творчасці Уладзіміра Караткевіча лічаць яго заснавальнікам беларускай гістарычнай літаратуры. Патрабуе больш глыбокага асэнсавання кінематаграфічная і тэатральная спадчына У. Караткевіча, асаблівасці перакладаў яго твораў на мовы свету. Імя Уладзіміра Караткевіча працягвае выклікаць актыўную даследчыцкую зацікаўленасць вучоных.


Літаратура:

1. Верабей, А.Л. Жывая повязь часоў: нарыс творчасці У. Караткевіча / А.Л. Верабей. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – 119 с.
2. Русецкі, А. Уладзімір Караткевіч: праз гісторыю ў сучаснасць: Нататкі літаратурнай творчасці / А. Русецкі. – Мінск: Мастацкая літаратура, 2000. – 300 с.


## АВТОРСКИЕ РЕМАРКИ КАК СРЕДСТВО РЕПРЕЗЕНТАЦИИ НЕВЕРБАЛЬНОЙ ИНФОРМАЦИИ В АНГЛОЯЗЫЧНОМ ПЕЧАТНОМ ИНТЕРВЬЮ


***Барковская Я.Л.,***

*студентка 5 курса ВГУ имени П.М. Машерова, г. Витебск, Республика Беларусь*

Научный руководитель – Бахтикиреева У.М., доктор филол. наук, профессор


Актуальность изучения невербальных средств общения, обусловлена тем, что с их помощью передается, как правило, больше информации, чем непосредственно в речевой деятельности. Исходя из того факта, что жесты, позы, движения, мимику достаточно сложно контролировать, исследователи предполагают, что по невербальному аспекту общения можно судить об истинных намерениях и эмоциональном состоянии собеседника [1]. В информационном пространстве печатных СМИ невербальные средства коммуникации чаще всего находят отражение в материалах интервью. Это позволяет журналисту передать атмосферу беседы, сохранить стилистические особенности, выражающие официальность, дружественность, иронию и т.д. Одним из самых действенных способов передачи невербального аспекта в публицистических тексах являются авторские ремарки, которые позволяют уточнить и дополнить высказывания собеседника, а также сделать интервью более образным и ярким.

В современной научной литературе проблема репрезентации невербальной информации в печатных СМИ рассмотрена не в полной мере. Изучению отдельных аспектов невербальной коммуникации в публицистическом тексте посвящены диссертации российских исследователей И.В. Юрченко, А.А. Аникаевой. Однако в своих работах ученые в основном рассматривают графическое оформление заголовков и цитат. Мы в свою очередь сфокусируем наше внимание на авторских комментариях в печатном интервью. Это в конечном итого предопределило цель нашей работы – рассмотреть стилистические особенности использования авторских ремарок в англоязычном печатном интервью.

**Материал и методы.** Материалом для исследования послужили статьи популярных англоязычных газет и журналов, таких как *Guardian, GQ, Inquirer, Telegraph*. В нашей работе мы использовали такие методы, как сплошная выборка эмпирического материала, его систематизация, тематический и дискурсивный анализ.

**Результаты и их обсуждение.** Детальный анализ и систематизация собранного практического материала исследования позволила нам выявить некоторые закономерности использования авторских ремарок в англоязычном интервью. Чаще всего они используются для:

а) уточнения содержания и смыла сказанного:

*– Is it harder still to capture that on the kind of big-budget blockbuster you sometimes make?* **–** Сложно ли сыграть такое в крупнобюджетных блокбастерах, в которых вы иногда снимаетесь?

*– In the movie made with green screen, where the director doesn't actually know what's behind you? Where they say, "Oh, we're going to have aliens?" Yes. (We both knew he was talking about Battlefield Los Angeles).* **–** В фильмах с зеленым фоном, в которых режиссер и сам точно не знает, что находится позади